Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Падарожжа па Беларусі
(канспект занятка па адукацыйнай вобласці “Дзіця і грамадства”)

Выхавальнік дашкольнай адукацйыі
Грышчанка Наталія Вікенцьеўна

Праграмныя задачы: фарміраваць уяўленні дзяцей пра асноўныя дзяржаўныя сімвалы Беларусі (сцяг, герб, гімн); развіваць памяць, мысленне, увагу, дыялагічную мову;

Выхоўваць павагу да сімволікі краіны.

Матэрыялы і абсталяванне: карта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўны сцяг, дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, стэнды з выявай прыроды Беларусі, паштоўкамі аб Мінску.

Папярэдняя работа: знаёмства дзяцей з глобусам, картай Рэспублікі Беларусь, развучванне вершаў, разглядванне ілюстрацый аб Беларусі, аб Мінску, экскурсіі па гораду, знаёмства з памятнымі мясцінамі.

Ход занятку

1.Гучыць песня "Журавы на Палессі ляцяць" (муз. І.Лучанка).

Педагог задае пытанні:

Дзеці, вам знаёма гэта мелодыя?

Аб чым гэта песня?

Сёння мы паразмаўляем аб нашай рэспубліцы, краіне, у якой мы жывём.

Якую назву мае наша рэспубліка?

2. Дзеці, паглядзіце, што ў мяне ў руках. Глобус - гэта мадэль нашай зямлі.

На ім вельмі многа розных дзяржаў, вялікіх і малых, кожная з якіх мае свой

колер. Тут ёсць і паша рэспубліка. А вось перад намі карта Беларусі.

Дзеці, як вы думаеце, чаму нашу рэспубліку называюць сінявокай?

Паглядзіце на тонкія сінія лініі і блакітныя плямы.

Што яны азначаюць? (Гэта абазначэнне рэк і азёр.) Якія рэкі і азёры Беларусі вы ведаеце? (Днепр, Прыпяць, Нетан, Дзвіна, возера Нарач).

Давайце яшчэ раз паглядзім на карту. Які колер пераважае на карце нашай рэспублікі?

Як вы думаеце, чаму пераважае зялёны колер, што гэта азначае? (Лясы.)

Наша рэспубліка багата лясамі. Лес называюць нашым багаццем.

Растлумачце, чаму (разглядванне карцін).

Разглядаем
Мы з Марусяй
Карту
Роднай Беларусі.
Колькі сёл тут,
Гарадоў!

Колькі рэчак
І лясоў!
Вадаёмаў жа,
Азёраў
Быццам тых
На небе зорак.
Што й казаць:
Багаты край
І прыгожы -
Чым не рай? (Кастусь Жук)

Шмат добрай музыкі ёсць на Беларусі. Давайце ўсе разам патанцуем, адпачнём! (Выконваецца танец "Лявоніха".)

На нашай планеце вельмі шмат розных дзяржаў. Людзі прыдумвалі сімвалы, якія абазначаюць прыналежнасць чалавека да пэўнай дзяржавы. У кожнай дзяржавы ёсць свае сімвалы: сцяг і герб.

Герб многа цікавага раскажа аб сваім народзе. Усё, што выяўлена на гербе, мае свае значэнне, якое зразумела людзям з розных краін, нават калі яны не ведаюць нашай мовы.

Як вы думаеце, што азначае зялёны контур у праменях сонца, якое ўсходзіць? Паглядзіце на карту нашай краіны. Параўнайце лінію контура на гербе і лінію контура на карце. Так, на гербе выяўлены межы нашай дзяржавы.

Промні ўзыходзячага сонца сімвалізуюць жыццё. Зямны шар на гербе гаворыць аб тым, што наш народ цэніць роўнасць усіх народаў на Зямлі. Герб з двух бакоў аплятаюць снапы каласоў, у якія ўплецены блакітныя вяночкі ільна і ружовай канюшыны. Гэта галоўныя прыродныя багацці нашай краіны. Лён – гэта расліна, з якой людзі здаўна робяць адзенне, ручнікі, сурвэткі, посцілкі.

Канюшына - лепшая прысмака для жывёл, якіх беларусы здаўна прыручылі і гадуюць.

Вянок з каласоў - сімвал галоўнага багацця – хлеба.

Беларусы кожную восень адзначаюць свята "Дажынкі", на якім узнагароджваюць лепшых хлебаробаў і плятуць вянкі з апошніх каласоў.

Такія вянкі пакідаюць у хаце да наступнай восені як сімвал багацця.

Паглядзіце ўважліва: чым абвіты каласы на гербе Беларусі? Гэта чырвона-зялёная стужка з надпісам "Беларусь".

У верхняй частцы герба ззяе чырвоная зорка. Аб чым яна сведчыць?

Зорка - гэта мужнасць нашага народа. Беларусы праявілі гераізм у шматлікіх войнах з рознымі захопнікамі.

Узгадайце і раскажыце, дзе вам прыходзілася сустракаць герб?

Перад вамі сцяг Рэспублікі Беларусь.У вялікія святы вуліцы горада ўпрыгожваюцца сцягамі.

Паглядзіце і скажыце, колькі колераў мае беларускі сцяг. Кожны колер мае свой сэнс.

Чырвоны колер - знак адвагі, колер крыві, якая была праліта ў барацьбе за шчаслівае жыццё. Разам з тым гэта колер радасці. Што сімвалізуе зялёны колер? (Багацце прыроды.)

Белы колер - сімвал свабоды, павагі да сваёй Айчыны, сімвал маральнай чысціні, якую цэняць нашы людзі. Яны імкнуцца выхаваць яе і ў сваіх дзяцей.

На сцягу ёсць незвычайны малюнак. Гэта фрагмент найбольш тыпічнага старажытнага арнаменту, распаўсюджанага ў народнай творчасці на тэрыторыі нашай краіны.

Наш народ працавіты, апрацоўвае зямлю, вырошчвае шмат культурных раслін. Дзе ячшэ вы бачылі такі арнамент? {На адзенні.)

Вось бачыце, якую цікавую гісторыю аб жыцці беларускага народа можа расказаць наш сцяг.

Ёсць яшчэ адзін важны сімвал любой краіны - гэта гімн. Гімн - галоўная мелодыя, якую іграюць на важных дзяржаўных сустрэчах і ў іншых урачыстых выпадках. Кожны народ паважае сімвалы сваёй краіны.

- Дзе вы чуеце гімн?

- Як слухаюць гімн? (Стоячы.) Усе людзі праяўляюць павагу да гэтага

сімвала. Давайце і мы ўважліва паслухаем Гімн Рэспублікі Беларусь. (Гучыць Гімн Рэспублікі Беларусь.) Шануйце і паважайце нашу краіну Рэспубліку Беларусь.

3.У якой краіне мы жывём?

Якія галоўныя сімвалы краіны?

Чаму нашу Беларусь называюць сінявокай?

Што азначае белы колер на беларускім сцягу?

Як слухаюць гімн?